Шыфр:____________________________

Колькасць балаў:_________________

Месца:___________________________

Зацвярджаю

Намеснік старшыні
арганізацыйнага камітэта
намеснік Міністра адукацыі

____________ Р.С. Сідарэнка

«21» студзеня 2015 года

ТРЭЦІ ЭТАП XXXII РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ
ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА»
І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

**11 клас**

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

## Варыянт I

**Заданне 1.** Запішыце беларускія адпаведнікі прыведзеных слоў, размяркоўваючы іх па групах у адпаведнасці з месцам націску.

*Максімальная колькасць балаў – 5* (0,5 бала – за кожны правільны адказ).

Пасмурный, деятель, крупный, диспансер, феномен, крапива, мускулистый, рассёдланный, ничему (не рад), семеро.

| Словы з першым націскным складам | Словы з другім націскным складам | Словы з трэцім націскным складам |
|---|---|---|
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |

**Заданне 2.** Да прыведзеных фразеалагізмаў падбярыце дзеясловы-суправаджальнікі, з якімі гэтыя фразеалагізмы ўжываюцца ў маўленні.

Запішыце фразеалагізмы разам з дзеясловамі-суправаджальнікамі ў табліцу, растлумачце значэнні фразеалагізмаў.

Узор: *як з вядра – ліць як з вядра.*

*Максімальная колькасць балаў – 5* (0,5 бала – за кожнае правільна падабранае слова-суправаджальнік,
0,5 бала – за кожнае правільнае тлумачэнне значэння фразеалагізма).

| Фразеалагізм | Фразеалагізм + дзеяслоў-суправаджальнік | Значэнне фразеалагізма |
|---|---|---|
| з вуха ў вуха | | |
| з хворай галавы на здаровую | | |
| як з пісанай торбай | | |
| боб з гарохам | | |
| на горкі яблык | | |

**Заданне 3.** Растлумачце лексічнае значэнне выдзеленых у сказах слоў.

*Максімальная колькасць балаў –5*

(1 бал – за кожнае правільна вызначанае значэнне слова).

| Сказ | Лексічнае значэнне слова |
|---|---|
| А каб зразумець, дзе гарэў сяржант, вялікім ***здагадзькам*** быць не трэба: у яго на пагонах маленькія танкі (*І. Сяркоў*). | ***Здагадзька*** – |
| Але і пайсці адсюль не выпадала: было зарана, адзінокі ***мінак*** на вуліцы тым болей прыцягваў да сябе ўвагу (*В. Быкаў*). | ***Мінак*** – |
| Сучаснаму чалавеку, абкружанаму з усіх бакоў разнастайнымі рэкламнымі ***спавешчаннямі***, патрэбна і “культуралагічная” рэклама (*ЛіМ*). | ***Спавешчанне*** – |
| Нейкаму капралу, які абразліва пакпіў з яго беларуска-сялянскай ***інакшасці***, Васіль выплюхнуў на галаву кацялок гарачага супу (У. Калеснік). | ***Інакшасць*** – |

| | |
|---|---|
| Праўда йдзе па зямлі, дзе ***сумёціца*** смецце, дзе за ёй неадступна цікуе мана (*Р. Барадулін*). | ***Сумёціца*** – |

**Заданне 4.** Запішыце аднаслоўныя беларускія адпаведнікі да прыкладаў на рускай мове. Вызначце, як яны ўтварыліся.

*Максімальная колькасць балаў* – ***6*** (0,5 бала за кожны правільна падабраны беларускі адпаведнік, 0,5 бала за кожную правільна вызначаную ўтваральную аснову і 0,5 бала за кожны правільна вызначаны спосаб утварэння).

| Прыклад на рускай мове | Беларускамоўны адпаведнік | Утваральная аснова | Спосаб словаўтварэння |
|---|---|---|---|
| **Узор:** *картофельная ботва* | *бульбоўнік* | *бульб(а) + оўнік (□)* | *суфіксальны* |
| прийти в сознание | | | |
| ремесло землекопа | | | |
| канун весны, предвесеннее время | | | |
| предприятие по производству растительного масла | | | |

**Заданне 5.** Запішыце складаныя назоўнікі ў форме меснага склону адзіночнага ліку.

*Максімальная колькасць балаў* – ***5*** (1 бал за кожнае правільна напісанае слова).

| Складаны назоўнік | Форма меснага склону адзіночнага ліку |
|---|---|
| жанчына-прафесар | |
| інжынер-маёр | |
| вакуум-камера | |
| матыль-бражнік | |
| камедыя-буф | |

**Заданне 6.** Вызначце, якія з выдзеленых дзеяслоўных форм утвораны з адхіленнямі ад граматычнай нормы. Запішыце правільны варыянт.

*Максімальная колькасць балаў* – ***4*** (1 бал за кожную правільна запісаную форму).

1. Прасек [дзядзька] палонку, крыгу *вынуў* [ ____________________ ], тады на бучык вока кінуў… (Я. Колас). 2. "А ў чым чалавечае шчасце, вяшчун?" – хацеў крыкнуць я, ды *змоўчаў* [ ____________________ ], бо ведаў, што ніхто не зможа даць адказ (Л. Дайнека). 3. Я знішчу свет, я знішчу чалавека. *Апрыкрылі* [ ____________________ ] і добрыя, бо хочуць дабрэйшымі зрабіцца за мяне (У. Караткевіч). 4. Міндоўг жа муляўся – з аднаго боку, заседзеўся ён у замку, войска новагародскае *прагла* [ ____________________ ] вольнага ветру паходаў, радасці здабычы і гарачага мяча (В. Іпатава). 5. Хто *занядужыць* [ ____________________ ] – дапаможа, хто разняверыцца – скране. Няпраўду праўда пераможа – і шчасце вас не абміне! (С. Панізнік).

**Заданне 7.** Перакладзеныя на беларускую мову электронным перакладчыкам афарызмы патрабуюць дадатковага рэдагавання. Знайдзіце ў кожным з іх памылку, замяніце правільнай формай, якая адпавядае сутнасці арыгінальнага суджэння.

Растлумачце прычыну памылак, якія дапускае электронны перакладчык.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

1) Утварэнне – тое, што застаецца пасля таго, калі забываецца ўсё, чаму вучылі (*А. Эйнштэйн*).

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

2) Юнацкасць бескарысная ў намерах і пачуццях, таму яна найболей глыбока разумее і адчувае праўду (*Г. Гейнэ*).

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

3) Мала хто з нас можа вынесці бярэмя багацця. Вядома, чужога (*М. Твен*).

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

4) Нехта не зможа выхаваць чалавека, калі ён сам сябе не выхоўвае (*В. Сухамлінскі*).

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

Прычына памылак:

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

**Заданне 8.** Запоўніце калонкі табліцы, у трэцюю – устаўце нумар прыклада з прыведзеных ніжэй, якія з'яўляюцца ілюстрацыямі той або іншай літаратурнай з'явы ці тэрміна.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| Літаратуразнаўчы тэрмін | Азначэнне тэрміна | Нумар прыклада |
|---|---|---|
| Санет | | |
| | Васьмірадковы верш, які часцей за ўсё пішацца пяцістопным ямбам і рыфмуецца па схеме *абабабвв* | |
| | Іншасказальнае адлюстраванне прадмета ці з'явы праз вобразы, якія маюць пераносны сэнс. | |
| | Верш з аб'яднаных папарна рыфмай вершаваных радкоў, напісаных шасцістопным ямбам з цэзурай пасля трэцяй стапы. Пры паўтарэнні ў творы некалькіх двухрадкоўяў абавязковым з'яўляецца чаргаванне мужчынскіх і жаночых рыфмаў. | |
| Амфібрахій | | |
| Анафара | | |

Прыклады:

| | |
|---|---|
| 1. Душой стаміўшыся ў жыццёвых цяжкіх бурах,<br>Свой век канчае ён у манастырскіх мурах.<br>Тут ціша, тут спакой, – ні шуму, ні клапот. | 4. Дружа, не будзь да аблудных бязлітасна строгі:<br>То не віна, а бяда іх; бяду – не карай.<br>Крыўдна, вядома, што збіліся людзі з дарогі |

| | |
|---|---|
| Ён пільна летапіс чацвёрты піша год<br>І спісвае усё ад слова і да слова<br>З даўнейшых граматак пра долю Магілёва.<br>І добрыя яго і кепскія дзяла<br>Апавядае тут. Так рупная пчала<br>Умее ў соты мёд сабраць і з горкіх кветак.<br>І бачанаму ім – ён годны веры сведак.<br>*Максім Багдановіч* | І не шануюць, як трэба, бацькоўскі свой край,<br>Хоць гаварылі яшчэ мудрацы-скамарохі:<br>“Помні: на роднай зямлі – і пад елкаю рай”.<br>Простыя ісціны часам так цяжка даюцца:<br>Покуль адолееш – слёз ручаіны пральюцца.<br>*Ніл Гілевіч* |
| **2.** Можна ўсё: пусціць каханне дымам,<br>Ўзяць і занядбаць мінулы шлях.<br>Але толькі – не любіць Радзімы<br>З чорнаю павязкай на вушах,<br>З чорнаю павязкаю на вуснах,<br>З чорнаю павязкай на вачах<br>*Уладзімір Караткевіч* | **5.** “Дзе вашы магілы, бацькі і дзяды?” –<br>У жвір, як у памяць, – лапата:<br>Дарог абарваных шукаюць сляды<br>Нашчадкі твае ў Курапатах.<br>*Васіль Зуёнак* |
| **3.** Каб жыццядайнасць не магла спыніцца,<br>Ты ў гэтым свеце характва жывеш.<br>Пакуль ты ёсць – працяг наш будзе віцца<br>За далеч часу – без канца, без меж.<br>Ты неперасыхальная крыніца<br>І поўная заўжды – не перап’еш.<br>Табой ніколі нам не наталіцца.<br>А дзе ж шукаць ратунак смазе? Дзе ж?<br>Яно нярэдка гэтак вось бывае,<br>Што смага – смагу большую раджае,<br>Дабро – несупакоенасць дабра.<br>І мы да слёз расчуленыя самі,<br>Вяселімся, што ты заўсёды з намі:<br>Ты – маці, жонка; ты – дачка, сястра.<br>*Янка Сіпакоў* | **6.** Старому Пеўню дрэнны сон прысніўся,<br>Устрапянуўся ён і…з седала скуліўся,<br>Штомоцы крыллямі залапатаў<br>І хрыпаватым басам закрычаў:<br>– Ку-ка-рэ-ку! Пажар, браточкі!<br>Ратуйся хто куды-ы-ы!<br>Стары і маладых…<br>Бо застануцца толькі вугалёчкі!<br>А следам Пеўнікі, як падгалоскі,<br>З двара у двор,<br>Ад вёскі і да вёскі…<br>Гарыць сыр-бор!<br><br>Хтось пусціць часам пагалоску,<br>А плеткарам і на руку –<br>Адразу закрычаць: – Ку-ка-рэ-ку!<br>*Эдуард Валасевіч* |

**Заданне 9.** У кожным з прапанаваных радоў адзін элемент будзе лішнім. Запішыце, што тут лішняе і патлумачце чаму.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

**1.** “Жалейка”, “Песні жальбы”, “Гусляр”, “Шляхам жыцця”:
Лішняе ______________________, бо ______________________________________
__________________________________________________________________.

**2.** “Подых навальніцы”, “Людзі на балоце”, “Мінскі напрамак”, “Павел прыехаў”:

Лішняе ____________________, бо ________________________________________
__________________________________________________________________.

**3.** “Чазенія”, “Ладдзя Роспачы”, “Званы Віцебска”, “Чорны замак Альшанскі”:
Лішняе ____________________, бо ________________________________________
__________________________________________________________________.

**4.** “Лявоніха на арбіце”, “Кім”, “Трыбунал”, “Выбачайце, калі ласка!”:

Лішняе ______________________, бо ____________________________________________

__________________________________________________________________________.

**5.** “Помста”, “Непаўторная вясна”, “Агонь і снег”, “Мост”:

Лішняе ______________________, бо ____________________________________________

__________________________________________________________________________.

**Заданне 10.** Прачытайце верш Максіма Танка “У Луўры” і запоўніце табліцу.

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

**Перад Джыякондай**

*Джыяконда! Я можа адзін з закаханых,*
Што прызнаннем не будзе табе дакучаць,
Хоць праехаў нямала дарог, акіянаў,
Каб пабачыць цябе, каб цябе прывітаць

І таму мне не лёгка расстацца з табою
(Хоць даўно ўжо мінуў аўдыенцыі час).
Не спытаўшыся, што ты за ўсмешкай сваёю
Скрыла ад Леанарда, хаваеш ад нас?

| | |
|---|---|
| **1.** Да якой разнавіднасці лірыкі можна аднесці гэты твор? | |
| **2.** Вершаваны памер першых чатырох радкоў | |
| **3.** Які тып рыфмоўкі выкарыстаны ў першых чатырох радках? | |
| **4.** Якая сінтаксічная (стылістычная) фігура выкарыстана паэтам у вылучаным курсівам радку? | |

2600